В. Бігеза, Н. Клімянкова

# Бібліятэкі і музеі ў сістэме інавацыйнай дзейнасці

Сваё 65-годдзе факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый УА «Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў» адзначыў арганізацыяй і правядзеннем міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Бібліятэкі і музеі ў сістэме інавацыйнай дзейнасці», што адбылася ў Мінску 21–22 кастрычніка 2009 г. Мерапрыемства было арганізавана сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі (НББ) і Беларускай бібліятэчнай асацыяцыяй (ББА). Інфармацыя аб канферэнцыі і яе праграма былі своечасова размешчаны на сайце ББА, што абумовіла актыўны ўдзел у ёй бібліятэчнай грамадскасці.

Хвалюючым момантам урачыстага адкрыцця мерапрыемства стала ўшанаванне ветэранаў факультэта – людзей, многія з якіх працавалі тут яшчэ ў складзе Мінскага педагагічнага інстытута імя А.М. Горкага. Гэта дацэнты В.А. Дукель, Л.М. Ісаенка, Т.А. Каралёва, Т.Ц. Князева, І.У. Уржынская, старшыя выкладчыкі Г.П. Сёміна і Т.І Чаплыгіна, старшы лабарант Н.М. Сівурава. Усім ім шчырае прывітанне і вялікую падзяку выказаў рэктар універсітэта Б.У. Святлоў.

З прывітальнымі словамі ў адрас факультэта і да ўдзельнікаў канферэнцыі звярнуліся рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў Б.У. Святлоў, дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Р.С. Матульскі, старшыня Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі Н.С. Чуева.

На пленарным пасяджэнні былі заслуханы даклады буйных спецыялістаў бібліятэчнай справы і бібліятэчнай адукацыі з Беларусі і Расіі. Перш за ўсё трэба адзначыць выступленні дэкана факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры і мастацтваў М.А. Яцэвіча і дэкана факультэта інфармацыйных рэсурсаў Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў А.М. Мазурыцкага. У дакладзе М.А. Яцэвіча «Вышэйшая бібліятэчная адукацыя ў Беларусі: традыцыі і інавацыі» былі акрэслены асноўныя вехі гісторыі і адметныя рысы сучаснага стану падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі ў Беларусі, намечаны перспектывы інавацыйнага развіцця факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый ва ўмовах глабалізацыі і ўкаранення сучасных інфармацыйных тэхналогій. А.М. Мазурыцкі ў дакладзе «Мадэрнізацыя бібліятэчнай адукацыі ў Расіі ва ўмовах Балонскага працэсу» закрануў сучасныя праблемы бібліятэчнай адукацыі ў Расіі з пункту гледжання адпаведнасці міжнародным стандартам і забеспячэння міжнароднай канвертацыі дыпломаў спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі.

Вялікую цікаўнасць бібліятэчнай грамадскасці выклікалі даклады наступных расійскіх удзельнікаў канферэнцыі: загадчыка сектара інавацыйнага развіцця бібліятэчна-інфармацыйнай сферы навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі Я.М. Гусевай «Інавацыйныя падыходы ў бібліятэчна-інфармацыйнай сферы», а таксама дырэктара бібліятэчна-інфармацыйнага цэнтра Уладзімірскага абласнога каледжа культуры і мастацтваў М.І. Рассадзінай «Прафесійная арыентацыя ў структуры бесперапыннай бібліятэчнай адукацыі». Яны пазнаёмілі ўдзельнікаў канферэнцыі з сучаснымі праблемамі расійскіх бібліятэк і сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў сярэдняга звяна, засярodзілі ўвагу на пошуку шляхоў інавацыйнага развіцця і спосабаў укаранення інавацый.

На пленарным пасяджэнні былі таксама заслуханы даклады дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Р.С. Матульскага «Кваліфікацыя бібліятэчных спецыялістаў як фактар паспяховага інфармацыйнага забеспячэння інавацыйнай дзейнасці», загадчыка лабараторыі Аб'яднанага інстытута праблем інфарматыкі Р.Б. Грыгянца «Фарміраванне рэсурсаў навукова-тэхнічнай інфармацыі для інфармацыйнага забеспячэння інавацыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь», загадчыцы навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я. Коласа НАН Беларусі Л.А. Аўгуль і намесніка дырэктара па навуковай рабоце гэтай жа бібліятэкі А.М. Дрозд «Кадравы патэнцыял і павышэнне эфектыўнасці інавацыйнага працэсу ў навуковай бібліятэцы», загадчыцы аддзела навукова-бібліяграфічнай работы Рэспубліканскай навукова-тэхнічнай бібліятэкі Н.В. Несцяронак «Дзейнасць РНТБ па інфармацыйнаму суправаджэнню інавацыйнага развіцця прадпрыемстваў і арганізацый Рэспублікі Беларусь», загадчыцы кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы БДУ культуры і мастацтваў С.В. Зыгмантовіч «Інавацыйныя падыходы да падрыхтоўкі бібліятэчных кадраў вышэйшай кваліфікацыі».

Пасяджэнні секцый адбываліся 22 кастрычніка як у памяшканні БДУ культуры і мастацтваў, так і ў прэс-цэнтры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. У рамках мерапрыемстваў, прысвечаных 65-годдзю факультэта, 16 кастрычніка 2009 г. прайшлі Другія Тышкевіцкія чытанні ў горадзе Лагойску, арганізаваныя кафедрай гісторыі Беларусі і музеязнаўства сумесна з Лагойскім гісторыка-краязнаўчым музеем імя К. і Я. Тышкевічаў і Лагойскім райвыканкомам. Усяго ж 22 кастрычніка працавала тры секцыі.

Секцыя «Сацыяльна-педагагічныя аспекты інавацыйнай дзейнасці бібліятэк. Бібліятэчная інаватыка» працавала ў памяшканні БДУ культуры і мастацтваў пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы Н.У. Клімянковай. З 12 заяўленых пленарных і 5 прыстэндавых дакладаў асобую цікавасць выклікалі выступленні супрацоўнікаў універсітэта Ю.М. Галкоўскай «Сацыяльна-педагагічныя асновы развіцця інавацыйнай дзейнасці бібліятэк Рэспублікі Беларусь», Н.У. Клімянковай «Бібліятэрапія як накірунак бібліятэчнай педагогікі: тэарэтыка-метадычны аспект», Н.Я. Петушкі «Сацыяльна-педагагічная дзейнасць бібліятэкі для сляпых як фактар развіцця асабістага патэнцыялу інвалідаў па зроку»,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

Т.А. Самайлюк «Праваслаўная бібліятэка: да пытання аб сістэмным аналізе фенамена», Г.К. Тычко «Літаратурна-мастацкая творчасць і яе роля ў дзейнасці бібліятэк», С.В. Саладоўнікава «Тэма кнігі і бібліятэкі ў навуковай фантастыцы і фэнтазі», І.А. Чупраковай «Бібліятэка як суб'ект фарміравання прававой культуры асобы», І.А. Сталяровай «Роля дзіцячай бібліятэкі ў карэкцыі дэвіянтных паводзін малодшых школьнікаў». Прадстаўнікі бібліятэчнай грамадскасці, што прысутнічалі на пасяджэнні секцыі, асобую ўвагу надалі абмеркаванню апошняга даклада, у якім была зроблена спроба навуковага асэнсавання і абгрунтавання вопыту практычнага прымянення бібліятэрапіі ў Магілёўскай цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя А.С. Пушкіна.

Была выказана прапанова мэтанакіравана рыхтаваць спецыялістаў да бібліятэрапеўтычнай дзейнасці як інавацыйнага кірунку абслугоўвання карыстальнікаў з псіхафізіялагічнымі асаблівасцямі і людзей, што апынуліся ў цяжкіх жыццёвых абставінах. Бібліятэкары-практыкі таксама падкрэслілі неабходнасць уввядзення двайной кваліфікацыі «Бібліятэкар – сацыяльны работнік».

Секцыя «Інфармацыйныя рэсурсы і інфармацыйныя тэхналогіі ў бібліятэках» праходзіла ў прэс-цэнтры НББ пад кіраўніцтвам А.Е. Далгаполавай, намесніка дырэктара па інфармацыйна-бібліятэчным абслугоўванні НББ, і В.М. Бігезы, дацэнта кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы БДУ культуры і мастацтваў. Было заслухана 12 дакладаў, 10 прадстаўлены ў якасці прыстэндавых. На секцыі прысутнічала каля 100 чалавек. У яе рабоце прынялі ўдзел вядучыя спецыялісты НББ, УНБ НАН Беларусі, выкладчыкі і студэнты БДУ культуры і мастацтваў, супрацоўнікі розных бібліятэк Беларусі.

Загадчык сектара падтрымкі сістэмы інфармацыйнага забеспячэння інавацыйнай дзейнасці НББ В.І. Брычкоўскі расказаў аб выкарыстанні тэхналогій Semantic Web для арганізацыі інфармацыйнага забеспячэння інавацыйнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь і тых праблемах, якія патрабуюць вырашэння ў бліжэйшы час. Галоўны бібліёграф НББ В.В. Дрыбін спыніўся на адметнасцях бібліяграфічных інавацый, якія ўкараняюцца супрацоўнікамі аддзела бібліяграфічнай апрацоўкі дакументаў, падкрэсліў важнасць падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў з веданнем замежных моў. Аб стане і сучасных праблемах стварэння нацыянальнай электроннай бібліятэкі, якая дазволіць аб'яднаць алічбаваныя інфармацыйныя рэсурсы ўсіх бібліятэк і інфармацыйных цэнтраў Беларусі з дапамогай карпаратыўных, нацыянальных і міжнародных сетак, паведаміла дырэктар інфармацыйнага цэнтра НББ А.А. Шарамецьева. Намеснік дырэктара па інфармацыйна-бібліятэчным абслугоўванні НББ А.Е. Далгаполава азнаёміла ўдзельнікаў секцыі з сучасным станам вырашэння праблемы электронных разлікаў за платныя бібліятэчныя паслугі.

Выступленне дацэнта кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры і мастацтваў І.М. Стрыжонак было прысвечана асвятленню тэарэтычных праблем інавацыйных падыходаў да фарміравання краязнаўчых дакументных інфармацыйных рэсурсаў у рэгіёнах Беларусі. Загадчык аддзела карпаратыўнага ўзаемадзеяння НББ А.М. Голубеў выступіў з дакладам, у якім ішла размова пра арганізацыйна-тэхналагічныя аспекты ўкаранення сістэмы карпаратыўнай каталагізацыі ў Рэспубліцы Беларусь. У канцы работы секцыі ён таксама расказаў прысутным аб стварэнні і функцыяванні віртуальнай чытальнай залы НББ. Праблемы і адметнасці каталагізацыі дакументаў па мастацтве ў фармаце BELMARC прагучалі ў дакладзе супрацоўніцы НББ С.У. Ільіной. Аналіз ядзерных палёў фарматаў MARC 21 і RUSMARC быў зроблены ў выступленні старшага навуковага супрацоўніка Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі М.Л. Халабія. Даклад дацэнта кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы БДУ культуры і мастацтваў В.М. Бігезы быў прысвечаны асаблівасцям стварэння і выкарыстання электронных рэсурсаў дзіцячых бібліятэк. Вопыт стварэння праектаў міжнародных цэнтраў па інфармацыйна-бібліяграфічнай дзейнасці ў розных сферах мастацтва, магчымасці ўключэння ў гэты працэс Рэспублікі Беларусь разгледжаны ў выступленні дацэнта кафедры інфармацыйных рэсурсаў Э.С. Суддзі. У дакладзе І.П. Скіндэр ішла размова пра рэтраканверсію алфавітнага каталога як складальнай працэсу аўтаматызацыі бібліятэчнай дзейнасці ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Я. Коласа НАН Беларусі. Пытанням сэнсавай апрацоўкі дакументаў пры вядзенні электроннага каталога ў ЦНБ НАН Беларусі быў прысвечаны даклад Л.Л. Астаповіч.

Пасля заканчэння работы секцыі былі выказаны наступныя прапановы: хадайнічаць перад Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь аб адкрыцці Рэспубліканскай дзіцячай бібліятэкі; ствараць і выкарыстоўваць электронныя рэсурсы бібліятэкі павінны і надалей ва ўмовах узаемадзеяння і карпаратыўнасці.

Секцыя «Бібліятэчная адукацыя: традыцыі і навацыі. Персанал бібліятэк» працавала ў зале пасяджэнняў Савета БДУ культуры і мастацтваў пад кіраўніцтвам С.В. Зыгмантовіч, загадчыцы кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы, і А.П. Карзанавай, загадчыцы аддзела бібліятэчнага маркетынгу Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк г. Мінска (ЦСДБ). Даклад прафесара кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый В.А. Касап «Інавацыі як аб'ект аналізу і выкладання ў БДУ культуры і мастацтваў» задаў тон абмеркаванню актуальных праблем укаранення інавацыйных падыходаў у працэсе падрыхтоўкі кадраў інфармацыйна-дакументнай сферы. Цікавымі былі выступленні і іншых супрацоўнікаў універсітэта. Гістарычную рэтраспектыву развіцця адной з вядучых кафедр факультэта ў адзінстве традыцый і інавацый прадставіла ў сваім дакладзе «Каля вытокаў вышэйшай бібліятэчнай адукацыі: кафедра бібліятэказнаўства – кафедра менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы» прафесар Л.А. Дзямешка. Цікавы, хоць і не бясспрэчны, вопыт кафедры інфармацыйных рэсурсаў знайшоў адлюстраванне ў выступленні старшага выкладчыка Л.І. Даніленкі «Бібліяграфічныя дапаможнікі як від дыпломных работ па спецыяльнасці». Інавацыйную накіраванасць праектнай дзейнасці бібліятэк падкрэсліла ў сваім дакладзе «Тэарэтычныя аспекты кіравання некамерцыйнымі бібліятэчнымі праектамі» прафесар кафедры менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы С.А. Паўлава. У выступленні дацэнта той жа кафедры Л.І. Ракавецкай «Арганізацыйная культура бібліятэкара» прааналізаваны сучасныя патрабаванні да персаналу бібліятэк ва ўмовах інфарматызацыі і інава-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыйнага развіцця. З дакладам «Кіраванне інавацыямі ў бібліятэках» выступіла аспірантка кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый Н.У. Балукова. На праблемах літаратурна-гуманітарнай падрыхтоўкі будучых бібліятэкараў засяродзілі ўвагу прафесар кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры В.А. Гуліцкая ў дакладзе «Культура мовы бібліятэкара» і дацэнт А.М. Пісарэнка ў выступленні «Вобразнае слова мастацкага тэксту як сродак выхавання студэнцкай моладзі ФІДК». Адметнай рысай работы секцыі можна лічыць актыўны ўдзел у абмеркаванні праблем бібліятэкараў-практыкаў. Інавацыйныя падыходы да абслугоўвання чытачоў у дзіцячых бібліятэках знайшлі адлюстраванне ў дакладзе «Працуем ярка, або Метадычная дзейнасць на карысць дзіцячага чытача» А.П. Карзанавай, загадчыцы аддзела бібліятэчнага маркетынгу ДУ «Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска». Праблемы інавацыйнага падыходу да развіцця персаналу бібліятэк вну акрэсліла ў сваім дакладзе «Кіраванне матывацыяй у сістэме развіцця персаналу бібліятэкі» І.Б. Стралкова, намеснік дырэктара бібліятэкі БДУ культуры і мастацтваў.

На секцыі было прапанавана ўвесці ў праграму падрыхтоўкі магістраў курсы «Інавацыйны менеджмент» і «Культура беларускага маўлення». Таксама падкрэслена неабходнасць перавыдання метадычных рэкамендацый па падрыхтоўцы дыпломных работ з улікам спецыфікі факультэта і надрукавання яго паўнаважкай гісторыі: матэрыялы збіраюцца на працягу многіх гадоў. Рэкамендавана таксама абагуліць вопыт работы ЦСДБ у навукова-практычным дапаможніку «Праектная дзейнасць дзіцячых бібліятэк» у серыі «Прафесіяналам бібліятэчнай справы».

Можна сказаць, што канферэнцыя з'явілася даволі прадстаўнічым форумам навукоўцаў і бібліятэчнай грамадскасці Беларусі, а ўдзел навукоўцаў і бібліятэкараў з Расійскай Федэрацыі надаў ёй міжнародны статус. Усяго ў мерапрыемстве ўдзельнічала больш за 250 чалавек. Было заяўлена 63 пленарных і 22 прыстэндавых даклады.

Асветленыя ў дакладах праблемы рэльефна акрэслілі сучасны стан і перспектывы інавацыйнай дзейнасці бібліятэк, а таксама і прафесарска-выкладчыцкі склад факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУ культуры і мастацтваў. Прапановы, якія прагучалі на пасяджэннях секцый, засяродзілі ўвагу на прыярытэтных кірунках бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці ва ўмовах інфарматызацыі.

**Summary**

The article presents the results of the International Scientific and Practical Conference "Libraries and museums in the frame of innovation activity". The authors pay special attention to the issues of library personnel training, social and pedagogical aspects of library activity as well as primary issues concerning information activity.

**В. Леончиков**

# Увлеченный наукой



*К 70-летию Валерия Александровича ФОКЕЕВА*

15 июля 2010 г. исполняется 70 лет известному российскому ученому Валерию Александровичу Фокееву – библиографу, доктору педагогических наук, действительному члену Международной академии информатизации при ООН.

Родился он в селе Радищево Ульяновской области в крестьянской семье. После окончания средней школы В.А. Фокеев поступает на библиотечный факультет Московского государственного института культуры, который успешно окончил в 1966 г. В 1965–1967 гг. работал методистом Ставропольской и Краснодарской краевых библиотек. Стремление и склонность к научно-исследовательской работе привели его в аспирантуру родного института, после окончания которой в 1970 г. ему была присуждена ученая степень кандидата педагогических наук. Педагогическую деятельность В.А. Фокеев начал в Хабаровском государственном институте культуры, где он заведовал кафедрой библиографии и преподавал (1971–1973 гг.). В январе 1974 г. по конкурсу В.А. Фокеев был зачислен доцентом кафедры библиографии Минского педагогического института им. А.М. Горького, а в апреле 1974 г. назначен заведующим кафедрой библиографии. Здесь он читал лекции студентам библиотечного факультета по курсу «Библиография общественно-политической литературы», «Общественно-политическая литература», «Советское библиографоведение на современном этапе». Его лекции любили студенты, ибо в основу их был положен метод проблемного обучения. С самого начала работы на библиотечном факультете В.А. Фокеев проявил себя как ученый и организатор научно-исследовательской работы. В.А. Фокеев инициировал создание научных трудов преподавателей библиотечного факультета. Уже в 1975 г. выходит сборник научных статей «Вопро-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ